# Малая радзіма — край натхнення: паэт Міхась Башлакоў дзеліцца ўспамінамі аб сваёй малой радзіме




*“Усё радзей мы прыязджаемТекст взят с сайта https://sozhnews.by/zhizn-rajona/malaya-rodina-kraj-vdokhnoveniya-poet-mikhas-bashlakov-delitsya-vospominaniyami-o-svoej-maloj-rodine*

Міхась Башлакоў, паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і расійскай прэміі Баяна, узнагароджаны медалём

Францыска Скарыны:

З гадамі ўсё часцей і часцей вяртаешся ў сваіх думках і ўспамінах у той родны бацькоўскі кут, дзе нарадзіўся і рос, дзе вучыўся ў школе і сталеў. У той запаветны край, які мы называем малой Радзімай. Больш як 70 вершаў прысвяціў я родным Гомельскім мясцінам. І не толькі. Праца над двухтомнай гісторыка-дакументальнай хронікай "Памяць. Гомельскі раён" – таксама частка майго жыцця і маёй душы.

І вось майму Гомельскаму раёну – 95 гадоў! З юбілеем, дарагія мае землякі! Плёну вам у жыцці і ў вашых справах на карысць нашай любай Беларусі! Святла, радасці, шчасця і моцнага ўсім здароўя!

У сувязі з юбілеем прысвячаю сваім землякам наступныя паэтычныя радкі:

*"Усё радзей мы прыязджаем*

*У край, дзе некалі раслі.*

*Малой Радзімай называем*

*Найдаражэйшы кут зямлі.*

*Было там поле, лес сасновы,*

*І рэчка светлая цякла.*

*І ў школе саладзела слова –*

*Там мова матчына цвіла.*

*Мы юнакамі спасцігалі*

*Жыццёвай мудрасці шляхі.*
*Айчыну, маці шанавалі,*
*Цяпло бацькоўскае страхі…*

*У дзіўна-сонечнае ранне*
*Вярнуў мяне зноў успамін:*
*Квітнела першае каханне,*
*Нібы за вокнамі язмін…*

*Срабрыліся на травах росы,*
*Гукалі ўдалеч цягнікі,*
*І мужыкі кляпалі косы,*
*І я шаптаў свае радкі…*

*Адтуль, ад матчынае песні,*
*Мая і вера, і любоў…*
*Мой родны край, маё Палессе,*
*Прымі пашану гэтых слоў!*

*І ў тым, што рэдка прыязджаю,*
*Я дадому, ёсць мая віна…*
*Малой Радзімы не бывае –*

*З вялікай літары яна!*